# АСНОЎНЫЯ ТЫПАЛАГІЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ХРЭСТАМАТЫЙ XXI СТ. ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМА

*У. І. Кулікові*ч

*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*вул. Свярдлова, 13А, 220050, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*nino1924kul@gmail.com*

Даследаванне прысвечана асэнсаванню тыпалагічных рыс вучэбнай літаратуры. На матэрыяле трох хрэстаматый, створаных у БДУ, устаноўлены адметнасці чытацкага адрасу, функцыянальнага прызначэння, структуры выданняў і кампазіцыйных элементаў аўтарскіх артыкулаў, іх актуальнасць, наяўнасць/адсутнасць электроннай версіі вучэбнага дапаможніка.

***Ключавыя словы:*** арфаграфія; графіка; хрэстаматыя; рэдактарская падрыхтоўка; тыпалогія выданняў; вучэбная літаратура.

# ОСНОВНЫЕ ТИПОЛОГИЧЕСКИЕ ХАРАКТЕРИСТИКИ ХРЕСТОМАТИЙ XXI В. ДЛЯ ИЗУЧЕНИЯ БЕЛОРУССКОГО ПИСЬМА

***В. И. Куликович***

*Белорусский государственный технологический университет,*
*ул. Свердлова, 13А, 220050, г. Минск, Республика Беларусь,*
*nino1924kul@gmail.com*

Исследование посвящено осмыслению типологических черт учебной литературы. На материале трех хрестоматий, созданных в БГУ, установлены особенности читательского адреса, функционального назначения, структуры изданий и композиционных элементов авторских статей, их актуальность, наличие/отсутствие электронной версии учебного пособия.

***Ключевые слова:*** орфография; графика; хрестоматия; редакторская подготовка; типология изданий; учебная литература.

У навуковай літаратуры пад тэрмінам хрэстаматыя (греч. chrestomatheia, от chrestos – карысны і manthno – вучуся) разумеюць вучэбную кнігу, дзе ў сістэматызаваным выглядзе пададзены літаратурна–мастацкія, афіцыйныя, навуковыя і іншыя творы або ўрыўкі з іх,

якія з’яўляюцца аб’ектам вывучэння пэўнай дысцыпліны ў школе ці ўстановах вышэйшай адукацыі (УВА) [1, с. 579]. Такое выданне прызначаецца, як правіла, для пашырэння ведаў чытача і павінна змяшчаць інфармацыю, якую тэзісна або схематычна прэзентуюць у сабе асноўныя падручнікі ці вучэбныя дапаможнікі.

Нягледзячы на асобныя недахопы, значэнне хрэстаматый, створаных з улікам развіцця новых педагагічных тэхналогій, цяжка пераацаніць у адукацыйным працэсе. У спалучэнні з асноўнай літаратурай яны фарміруюць уяўленне студэнта пра узорныя, эталонныя работы ў прадметнай сферы; развіваюць аналітычныя і крытычныя навыкі пры параўнанні тэкстаў; садзейнічаюць выпрацоўцы ўласнай пазіцыі па важных пытаннях навукі і культуры; спрыяюць стварэнню свайго навуковапрактычнага даследавання.

Патрэба ў такім даследаванні абумоўлена распрацоўкай на кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій спецыяльнай тэматычнай хрэстаматыі «Дынаміка нормаў беларускай мовы. Графіка і арфаграфія». Вынікі аналізу існаваных вучэбных дапаможнікаў дазволяць унесці шэраг станоўчых элементаў у праектаванае выданне, будуць спрыяць пашырэнню вопыту, эрудыцыі не толькі аўтара-складальніка, але і рэдактара – спецыяліста кніжнай справы, ад якога патрабуюцца ўменні, навыкі праектаваць і канструяваць выданне, быць яго непасрэдным выканаўцам, арганізатарам і кіраўніком. Практычны досвед артыкула можа быць выкарыстаны ў практыцы выкладання ва УВА, пры распрацоўцы спецкурса па складанні і рэдагаванні хрэстаматый. Праект можа быць цікавы шырокаму колу чытачоў: студэнтам вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія спецыялізуюцца на вывучэнні выдавецкай справы і паліграфіі, выдаўцам і супрацоўнікам выдавецтваў, удзельнікам студэнцкіх навуковых гурткоў.

Намі было выяўлена 18 хрэстаматый, створаных цягам XX і XXI стст, прысвечаных вывучэнню беларускай мовы. З іх 13 змяшчаюць дыялектны матэрыял, а таксама тэксты розных стыляў у розныя перыяды існавання беларускай мовы. Да такіх работ адносяцца, напрыклад, выданні: *Бубновіч І. І. Гісторыя беларускай мовы: хрэстаматыя / І. І. Бубновіч, Н. К. Памецька, Ж. С. Сіпліведня. Гродна: ГрДУ, 2009. 239 с.; Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі: Цэнтральная зона / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. В. Д. Астрэйка [і інш.]; навук. рэд. Л. П. Кунцэвіч, В. М. Курцова. Мінск: Беларус. навука, 2009. 529 с.; Хрэстаматыя па гісторыі беларускай*

*мовы / АН Бел. ССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. Мінск: Выд-ва акадэміі навук БССР, 1961. 865 с.* і іншыя.

Мы ж спынімся на сціслай характарыстыцы толькі трох, якія маюць пэўнае дачыненне і падабенства да праектаванага намі выдання.

Першая з іх *Беларуская мова: хрэстаматыя: вучэб. дапам. / аўт.-склад.: З. І. Бадзевіч [і інш.]. Мінск: Юнипресс, 2005. 592 с.* У хрэстаматыю ўключаны выбраныя працы па ўсіх раздзелах курсаў «Сучасная беларуская мова» «Стылістыка і культура беларускай мовы». Пры падборы артыкулаў, як сцвярджаецца ў прадмове, аўтарыўкладальнікі кіраваліся двума прынцыпамі: навуковай вартасцю працы і яе лінгва–дыдактычным патэнцыялам. Чытацкі адрас хрэстаматыі – вучні старшых класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў, гімназій, настаўнікі і студэнты. Раздзел «Арфаграфія» прадстаўлены шасцю матэрыяламі: невялікім фрагментам (1 с.) з кнігі «Беларуская граматыка для школ» (1918 г.) Б. Тарашкевіча; фрагментам з кнігі І. Я. Лепешава «Сучасная беларуская літаратурная мова: Спрэчныя пытанні» (2002); артыкулам Л. М. Шакуна «Роля Б. А. Тарашкевіча ў развіцці беларускай літаратурнай мовы»; артыкулам А. І. Падлужнага «Цяжкія выпадкі правапісу е, я ў ненаціскных складах» (гэты артыкул змяшчаюць часта і складальнікі іншых хрэстаматый, што на наш погляд, рабіць не варта); артыкулам М. Р. Судніка «Пытанні арфаграфіі і моўная практыка адносна напісання слоў не рэгламентаваных арфаграфічна»; артыкулам Л. І. Сямешкі «Кадыфікацыя арфаграфічных норм». Характэрнымі рысамі гэтай хрэстаматыі, на наш погляд, можна лічыць: 1) актуальнасць артыкулаў, змест якіх адлюстроўвае складаныя выпадкі напісання асобных слоў; 2) электронная версія, змешчаная ў свабодным доступе; 3) адсутнасць прадмовы да кожнага раздзела, у якой былі б акрэслены прынцыпы адбору матэрыялу; 4) адсутнасць інфармацыі пра аўтараў; 5) адсутнасць кантрольных пытанняў і заданняў, што, як паказала практыка і даследаванні псіхолагаў, істотна ўплывае на якасць засваення матэрыялу.

Другая кніга *Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918–1941) : хрэстам. для студ. філ. фак. : у 2-х ч. / аўт.-склад. С. М. Запрудскі, Г. І. Кулеш. Мінск: БДУ, 2005*. У гэтым выданні маецца асобны раздзел пад назвай «Распрацоўка правапісу ў 1920-я г.». Ён цалкам прысвечаны дыскусіям адносна беларускага правапісу, што адбываліся падчас працы Акадэмічнай канферэнцыі 1926 г. Тут змешчаны: інфармацыя пра Акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускага правапісу і азбукі;

артыкул Я. Лёсіка «Да рэформы нашай азбукі»; выступленні ў дыскусіі аб рэформе азбукі Я. Лёсіка; артыкул Я. Лёсіка «Да рэформы беларускага правапісу»; артыкул С. Некрашэвіча «Да пытання аб рэформе нашага правапісу»; заява Я. Лёсіка, Я. Коласа, А. Лёсіка і Я. Купалы ў Прэзідыум правапіснай камісіі; артыкул К. Езавітава «Справаздача аб рабоце правапіснай камісіі»; рэзалюцыя аб рабоце Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі; Заключнае слова У. Ігнатоўскага; прамова М. Фасмера на заключным пасяджэнні канферэнцыі.Характэрнымі рысамі гэтай хрэстаматыі з’яўляюцца наступныя: 1) актуальнасць артыкулаў, змест якіх адлюстроўвае складаныя пытанні станаўлення і выпрацоўкі арфаграфічных нормаў беларускай мовы ў 20-я г. XX ст.; 2) электронная версія, змешчаная ў свабодным доступе ў электроннай бібліятэцы БДУ; 3) наяўнасць уводзінаў да кожнага раздзела, дзе тлумачацца прынцыпы адбору матэрыялаў іх вартасць; 4) наяўнасць інфармацыі пра аўтараў; 5) адсутнасць пытанняў і заданняў пасля кожнага тэксту.

Трэці вучэбны дапаможнік *Сучасная беларуская мова. Хрэстаматыя: дапаможнік. У 2 ч. Ч. 1. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Марфеміка. Марфаналогія. Словаўтварэнне. Марфалогія / склад.: А. Л. Садоўская [і інш.]. Мінск: БДУ, 2022. 319 с.* У склад гэтага дапаможніка ўваходзяць навуковыя публікацыі і фрагменты навуковых і навукова-метадычных работ, змест якіх адпавядае праграме навучальных дысцыплін модуля «Сучасная беларуская мова». Тэксты, якія змяшчаюцца ў кнізе, прызначаны для выкарыстання ў педагагічным працэсе ва УВА пры падрыхтоўцы студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей з мэтай садзейнічаць фарміраванню неабходных прафесійных уменняў і навыкаў. У выданні маецца раздзел, што дазваляе вывучаць сістэму беларускага пісьма. Ён называецца «Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія». Тут графіка і арфаграфія беларускай мовы прэзентуюцца чатырма артыкуламі: Яновіч А. І. Станаўленне графічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы новага перыяду (с. 78–83); Іўчанкаў В. І. Закон «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (с. 84–92); Іўчанкаў В. І. Фіналі *-аль, -ар* у медыйнай практыцы (с. 93–96), Кандрацене, І. У., Кунцэвіч Л. П., Лукашанец А. А. Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі (с. 97–103).Асноўных тыпалагічных характарыстык выдання таксама пяць: 1) наяўнасць электроннай версіі ў электроннай бібліятэцы БДУ; 2) функцыянальнае прыз-

начэнне – дапамагчы выкладчыку выбраць педагагічна мэтазгодныя шляхі і формы работы са студэнтамі, а таксама пасадзейнічаць развіццю базавых і прадметных кампетэнцый студэнтаў і сістэматызаваць веды аб асноўных лінгвістычных законах, розных падыходах да тлумачэння моўных з’яў; 3) тэксты артыкулаў забяспечаны мінімальным апаратам (назва артыкула, аўтар, спіс літаратуры) і з’яўляюцца дадатковым навучальным матэрыялам да навучальных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў па дысцыплінах модуля «Сучасная беларуская мова»; 4) адсутнасць фотаздымакаў аўтараў, звестак пра аўтараў, а таксама пытанняў і заданняў пасля тэкстаў; 5) падзел кнігі на часткі ў адпаведнасці з тэматычным прынцыпам: маюцца ўводзіны, дзе сабраны артыкулы аб функцыянаванні беларускай літаратурнай мовы, а таксама наступныя раздзелы: Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія; Лексікалогія; Лексікаграфія; Фразеалогія; Марфеміка; Марфаналогія; Словаўтварэнне; Марфалогія з падраздзеламі: Назоўнік. Прыметнік. Лічэбнік. Займеннік. Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе. Прыслоўе. Безасабова – прэдыкатыўныя словы.

Такім чынам, можна сцвярджаць што пры падрыхтоўцы хрэстаматый, дзе маюцца матэрыялы, прысвечаныя беларускаму пісьму, аўтарыскладальнікі – выкладчыкі БДУ, адрасуюць іх найперш студэнтам-філолагам і настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Кожная са створаных хрэстаматый мае электронную версію, размешчаную ў электроннай бібліятэцы БДУ, што значна спрашчае пошук інфармацыі і працу з ёй. Прапанаваныя ў выданні артыкулы на высокім навукова-практычным узроўні захоўваюць і транслююць традыцыі акадэмічнай культуры, служаць прыкладам кваліфікаванага навуковага адбору матэрыялу, выконваюць адукацыйна-выхаваўчую функцыю. Структура і афармленне артыкула хрэстаматыі аднатыпныя: за выключэннем хрэстаматыі С. Запрудскага і Г. Кулеш, дзе маюцца сціслыя звесткі пра аўтараў, астатнія выданні такога апаратнага элемента не ўтрымліваюць, як не ўтрымліваюць сродкаў візуалізацыі (напрыклад, фотаздымкаў аўтараў), пытанняў і заданняў для самаправеркі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Книговедение: энциклопедический словарь / Ред. коллегия: Н. М. Сикорский (гл. ред.) и др. М. : Сов. энциклопедия, 1982. 664 с.